ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1982
28
КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 30 (1368)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

**Работнікі ВНУ і тэхнікумаў! Рыхтуйце ідэйна загартаваных, высокакваліфікаваных спецыялістаў!**

**Развівайце навуку, умацоўвайце сувязь з вытворчасцю!**

(З Заклікаў ЦК КПСС).

"Беларускі універсітэт" тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### АДКРЫТЫ ПРАГЛЯД

літаратуры па тэме «Гісторыя міжнароднага камуністычнага і рабочага руху ў 1918—1939 г.г.» праводзіць сёння аддзел навуковай і мастацкай літаратуры бібліятэкі сумесна з кафедрай новай і навейшай гісторыі. Прагляд арганізаваны ў дапамогу студэнтам IV курса гістарычнага факультэта.

На выстаўцы прадстаўлены творы класікаў марксізму-ленінізму, матэрыялы з'ездаў партыі, манаграфіі грамадска-палітычных дзеячаў, іншая гістарычная і мастацкая літаратура. Кнігі, якія будуць на праглядзе, выдаюцца на дом.

З. ШАЛУПЕНКА,
галоўны бібліятэкар.

### СТУДЭНЦКАЕ НАВУКОВАЕ ТАВАРЫСТВА

«Сусвет», арганізаванае ў БДУ як секцыя Мінскага аддзялення Усесаюзнага астранамічна-геадэзічнага таварыства, запрашае ўсіх жадаючых на свае пасяджэнні, якія будуць праходзіць пачынаючы з 3 лістапада ў аўдыторыі № 477 фізічнага корпуса. Дзень і час заняткаў — кожная серада, 19 гадзін 10 мінут.

Члены навуковага таварыства вядуць самастойныя даследаванні, абмяркоўваюць новыя здабыткі вучоных у галіне навук аб сусвеце.

В. ГУРЫН,
член навуковага студэнцкага савета.

### КІНАЛЕКТОРЫЙ

на тэму «Сучаснае буржуазнае кіно. Крызіс сістэмы «кіназорак» прайшоў у рамках кінауніверсітэта для дарослых «Кінамастацтва нашых дзён» і студэнцкага кінауніверсітэта «Кіно і час», якія арганізаваны беларускім аддзяленнем Усесаюзнага бюро прапаганды кінамастацтва.

На кіналекторыі былі прадэманстраваны фрагменты з фільмаў «Прынц Даміно», «Пагоня», «Аклахома як яна ёсць», «Дом пад дрэвамі». Гледачы ўбачылі мастацкі фільм «Забаўныя прыгоды Дзіка і Джэйн». Лекцыю чытаў навуковы супрацоўнік АН БССР Б. Ракіцкі.

У. АБРАМОВІЧ.

### ТВОРЧАЯ СУСТРЭЧА

з заслужаным артыстам РСФСР, акцёрам тэатра імя Ленінскага камсамола Рамакам Грамадскім адбылася ва універсітэце. Акцёр адказаў на шматлікія пытанні слухачоў, расказаў пра сваю творчую дзейнасць у тэатры і кіно. У ходзе сустрэчы былі паказаны фрагменты з кінафільмаў, у якіх здымаўся Р. Грамадскі.

Э. АНІСЕНКА,
мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.



# ЧАС СТАЛАСЦІ І МАЛАДОСЦІ

## РЭПАРТАЖ

*Кафедра фізікі цвёрдага цела адзначае свой юбілей. Чвэрць стагоддзя назад, у кастрычніку 1957 года, загадам Міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР была створана кафедра фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў (апошняя ў 1966 годзе выдзелілася ў самастойную адзінку). У розныя часы кафедру ФЦЦ узначальвалі вядомыя вучоныя-фізікі — акадэмік АН БССР М. М. Сірата, прафесар М. Ф. Кунін, дацэнты Г. В. Шыбаева і Г. А. Гуманскі. Мяняліся кіраўнікі, распрацоўваліся новыя напрамкі навуковых пошукаў, ды нязменнымі заставаліся традыцыі кафедры...*

**— А яны сапраўды багатыя, — расказвае яе сённяшні загадчык, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР прафесар Усевалад Паўлінавіч Гольцаў. — Адкрыццё кафедры было прадыктавана імклівым развіццём навукі і тэхнікі. Для стварэння сучаснай радыёэлектроннай апаратуры, вылічальнай тэхнікі, магутных атамных рэактараў, для палётаў у космас неабходны новыя матэрыялы, якіх часам не сустрэнеш у прыродзе і якія б адпавядалі пэўным характарыстыкам. І вось тут на дапамогу чалавеку прыходзіць фізіка цвёрдага цела — навука аб сувязі паміж саставам, структурай і ўласцівасцямі рэчыва.**

Убачыўшы, што маю ўвагу прыцягвае невялікі стэнд на рабочым стале, прафесар тлумачыць:

**— Гэта якраз і з'яўляецца пацвярджэннем актуальнасці нашых пошукаў — плёначныя вымяральныя пераўтваральнікі на аснове паўметалаў. Калі работа звычайных крэмніевых ці германіевых паўправаднікоў у значнай ступені залежыць ад прымесей і вонкавых умоў — хістання тэмпературы, ціску, выпраменьвання, то тыя ж паўправаднікі, створаныя на аснове тонкіх плёнак, мала адчувальныя да гэтых уздзеянняў.**

Разглядваю штучныя «сняжынкі», тонкае шкло-падложку, пакрытае мудрагелістым узорам сплаву вісмуту і сурмы. Цяжка ўявіць, што яе таўшчыня (калі так можна назваць тонкі слой пакрыцця) складае мільённыя долі сантыметра, а па сваіх якасных характарыстыках і памерах плёначныя вымяральныя пераўтваральнікі намнога пераўзыходзяць звычайныя паўправаднікі.

Уважліва слухаю Усевалада Паўлінавіча. Даведваюся, што сёння на кафедры існуе 6 навуковых і 4 вучэбныя лабараторыі. На яе аснове створаны міжвузаўскі цэнтр абслугоўвання навуковых даследаванняў. Тут будучыя фізікі набываюць практычныя навыкі работы са складанымі прыладамі, замацоўваюць набытыя тэарэтычныя веды.

**— Такое актыўнае далучэнне да творчых пошукаў прыносіць жаданыя вынікі. Былы студэнт-вячэрнік Валерый Саладуха выканаў дыпломную работу, якая затым знайшла практычнае прымяненне ў вытворчасці. Эканамічны эфект ад яе ўкаранення склаў 300 тысяч рублёў. Больш таго, малады вучоны атрымаў два пасведчанні на вынаходніцтва.**



У. П. Гольцаў вядзе мяне ў лабараторыю тонкіх плёнак, што размясцілася ў суседнім пакоі. Над пультам ўнушальных памераў установкі схіліўся супрацоўнік. Падыходжу бліжэй, знаёмлюся.

Рашыд Халімі, аспірант з Алжыра, працуе над атрыманнем тонкіх металічных плёнак. Гэтыя доследы лягуць у аснову яго будучай кандыдацкай дысертацыі.

Лёгкі дотык да кнопкі — і вось ужо запрацавала сістэма адпампоўвання паветра, папаўзла ўверх стрэлка на шкале.

**— Калі ў звычайным асяроддзі і пры звычайным атмасферным ціску малекулы кіслароду знаходзяцца ў пастаянным сутыкненні адна з адной, то ў камеры яны прабягаюць некалькі дзесяткаў сантыметраў да сутыкнення, — тлумачыць Рашыд. — Толькі пры такім фантастычна малым ціску магчыма разлічваць на поспех эксперымента.**

Пасля таго, як установка набярэ зададзены рэжым, Рашыд змесціць пад каўпак маленькі кавалачак спектральна чыстай медзі, падложку, уключыць высокае напружанне і праз некаторы час медзь ператворыцца ў пар, які, кандэнсуючыся, тонкім слоем пакрые паверхню падложкі, набудзе зададзеную форму.

**— Сам працэс атрымання плёнкі складаным не назавеш, — гаворыць старшы лабарант Дзмітрый Гарбачэўскі. — Значна цікавей — абмеркаванне вынікаў даследаванняў: тут і прагнозы, і ідэі, і нестандартныя рашэнні. «Фантазія важней за веды», — гаварыў некалі Альберт Эйнштэйн.**



Напэўна, удалае спалучэнне фантазіі і няўрымслівасці маладых, учарашніх выпускнікоў фізфака Дзмітрыя Гарбачэўскага, Аляксандра Янушэўскага, Святаслава Язычэнкі з вопытам кіраўніка работ, дэкана факультэта, дацэнта Э. М. Шпілеўскага якраз і прывяло да таго, што ў мінулым годзе супрацоўнікамі лабараторыі пададзена 7 заяў на вынаходніцтва.

На развітанне Рашыд падараваў мне адзін са шматлікіх узораў сваіх доследаў. Разглядваю яго і думаю: сёння гэта звычайны кавалачак шкла з напыленай на яго паверхню меддзю, а заўтра... Ці не ляжа ён тым галоўным каменьчыкам у высокую вежу навуковых адкрыццяў?

А. ЛАЗОЎСКІ.

**НА ЗДЫМКАХ: супрацоўнікі кафедры — старшы выкладчык В. М. Драко, дацэнт Г. В. Шыбаева, прафесар У. П. Гольцаў, дацэнт Э. М. Шпілеўскі; загадчык лабараторыі міжвузаўскага цэнтра У. В. Панарадаў і старшы інжынер Ю. А. Даніловіч за даследаваннем структуры абпрамененых матэрыялаў; у вучэбнай лабараторыі.**

Фота В. ШАЧАКА.



## БДУ — ВА «ІНТЭГРАЛ»

**Мацнее і развіваецца творчае супрацоўніцтва паміж калектывамі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна і ВА «Інтэграл». Дыяпазон сувязей шырокі — ад сумеснай навукова-тэхнічнай творчасці да агульных палітычных і культурна-масавых мерапрыемстваў. Сцвярджэннем гэтаму стане і сумеснае святкаванне 65-й гадавіны Вялікага Кастрычніка.**

**Аб двойчы ардэнаносным калектыве расказваюць на гэтых старонках карэспандэнты газеты «Интеграл».**

## ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

**● За вялікі ўклад у развіццё айчыннага прыладабудавання, дасягнутыя поспехі ў павышэнні эфектыўнасці вытворчасці і датэрміновае выкананне заданняў 9-й пяцігодкі ў 1974 годзе вытворчае аб'яднанне «Інтэграл» было ўзнагароджана ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі. У 1976 годзе ЦК КПБ і Савет Міністраў рэспублікі прысвоілі прадпрыемству імя XXV з'езда КПСС. За датэрміновае выкананне 10-й пяцігодкі аб'яднанне ўзнагароджана ў 1981 годзе ордэнам Леніна.**

**● Сотні рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў, служачых прадпрыемства адзначаны ўзнагародамі Радзімы. Чацвёра з іх удастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы — генеральны дырэктар ВА «Інтэграл» П. П. Гайдэнка, слесар цэха № 19 У. У. Заблоцкі, настройшчыца цэха № 21 Я. В. Салаўёва, слесар цэха № 28 А. А. Комаш.**

**● Шэраг калектываў аб'яднання носяць ганаровае званне «Калектыў камуністычнай працы». Сярод іх — 3 цэхі, 7 аддзелаў, 69 участкаў, 83 змены, 86 брыгад.**

**● Першымі брыгадамі выдатнай якасці сталі калектывы Т. М. Федарэнка і Т. М. Бязручка. Зараз іх налічваецца 35. Выдатнікамі якасці з'яўляюцца 708 чалавек, 891 работнік працуе з асабістым кляймом.**

**● Каля 8 тысяч рацыяналізатараў працуе на прадпрыемстве. Толькі ў мінулым годзе яны падалі 20 587 прапаноў, з іх ўкаранёна ў вытворчасць 1238.**

**● З 1975 года ў аб'яднанні пачата серыйная вытворчасць наручных электронных гадзіннікаў. Незадоўга да адкрыцця XXVI з'езда КПСС была сабрана пяцімільённая «Электроніка», а ў красавіку 1982 года гэта лічба дасягнула 10 мільёнаў.**

# Нараджэнне «Электронікі»

**ЦІ НЕ ЖАДАЕЦЕ ДАВЕДАЦЦА, ЯК «НАРАДЖАЮЦЦА» ЭЛЕКТРОННЫЯ ГАДЗІННІКІ?**

...РАБОТНІЦЫ ў белых халатах — сапраўдныя чараўніцы — лоўка збіраюць дэталі наручных гадзіннікаў. Сэрца гадзінніка — плата са шматлікімі навяснымі элементамі. Як не існуе карціны мастака без палатна і фарбаў, так няма гадзінніка без платы. Галоўную ролю тут адыгрывае крышталь, пакрыты герметыкам. Ён малюсенькі і далікатны. Зялёнае яго футра не ведае ні пылу, ні вялікіх тэмператур. Крышталь жывіцца энергіяй ад спецыяльных, такіх жа як і ён малюсенькіх, элементаў. Запасаў іх энергіі хопіць на цэлы год. Калі плата праверана на годнасць, яе знаёмяць з вадкасна-крышталічным індыкатарам. Ім абодвум давядзецца сумесна працаваць.

У індыкатара гладкая паверхня. Табло на ім бачна добра са знешняга боку. Гэты жывы цыферблат запамінае час і назву дня тыдня, пакуль на яго дзейнічаюць знешнія палі. Паляроідная плёнка індыкатара — своеасаблівая прахадная для святла — прапускае праменні толькі да маленькіх сегментаў — лічбаў, што адлічваюць час.

А работу ўсіх вузлоў — лічыльнікаў блоку — правяраюць на вылічальным комплексе за секунды. Злева, ад вялікіх шафаў, начыненых найскладанейшымі схемамі, стаіць стол з тэлевізарам. У невялікае гняздо, уманціраванае ў накрыўку стала, работніца ўстанаўлівае блок. Лёгкі дотык да кнопак кіравання — і на экране мы бачым запраграміраваныя кантрольныя станы блоку. Восем секунд — такая працягласць аперацыі. Работа на комплексе ў пятнаццаць разоў прадукцыйней, чым ручная.

Калі блок уставяць у металічны корпус, гадзіннік набывае знаёмае аблічча. І больш прыгожай становіцца «Электроніка», калі ў корпус устаўляюць каляровую маску. Перш чым корпус загерметызаваць, з яго ўдаляюць пылінкі. А робяць гэта пры дапамозе паветранага струменю, які вырываецца з мініяцюрных насадак-шчотачак.

Аперацыя настройкі на рабочую частату — падобна на настройку радыёпрыёмніка на патрэбную радыёстанцыю. Вылічальны комплекс дапамагае ўстанавіць гэты правільны крок.

Хуткасць ўстаноўлена — патрэбна затрымаць і тое імгненне, ад якога пачнецца адлік будучага часу жыцця гадзінніка. І гэтае імгненне — дакладны маскоўскі час, які запраграміраваны ў вылічальную машыну. Функцыя работніцы — толькі падвесці да гадзіннікаў магнітныя ўключальнікі.

Гадзіннік гатоў. Але наперадзе ў яго выпрабаванні на ўстойлівасць да цяпла і холаду, на адчувальнасць да ўдараў. І толькі пасля гэтых аперацый ён паступае да спажыўца.

Так збіраюць гадзіннікі «Электроніка» — дзіўную прыладу, якая вельмі неабходна ў нашым быце.

**К. СТАЛЯРЧУК.**



**На здымках:** ідзе зборка гадзіннікаў; кантралёры АТК Ірына Матус, Жана Зуёнак і Ала Саўчанка правяраюць гатовую прадукцыю.

Фота **А. Ерзянкова.**

# Рамантыка вандраванняў

ДРУЖАЦЬ НА «ІНТЭГРАЛЕ» са спортам. Асабліва шырокае развіццё атрымаў на аб'яднанні турызм. У секцыях воднікаў, пешаходнікаў, горнікаў з навічкамі праводзяць агульнафізічныя і тэхнічныя трэніроўкі. Перш чым выйсці на крутую горную сцяжынку, турыст павінен умець правільна карыстацца ледаколам, крукам, умець звязваць вяроўкі, хадзіць па стромкіх схілах, ставіць палатку, распальваць прымус. Такіх неабходных у турысцкіх паходах навыкаў шмат. З часам іх колькасць павялічваецца, турыст становіцца больш вопытным і мае права ісці ў больш складаны паход.

Сёння ў секцыях турклуба аб'яднання — сотні членаў. Шматлікія паходы ў розныя перыяды года ад першай да самай высокай — пятай — катэгорыі складанасці пакідаюць незабыўнае ўражанне ў кожнага, хто зведаў рамантыку вандраванняў. Іменна ў іх пазнаецца сапраўдная дружба, узаемадапамога.

На аб'яднанні традыцыйнымі сталі паходы выхаднога дня. Іх праводзіць кожны цэх. Зборная каманда турклуба неаднаразова перамагала на спаборніцтвах раённага, гарадскога і рэспубліканскага маштабаў. У яе ўваходзяць лепшыя скалалазы, альпіністы, турысты-горнікі, воднікі, — тыя, у каго вялікі багаж майстэрства ў тэхніцы пешых і водных падарожжаў.

Амаль усе турысцкія раёны краіны знаёмы нашым спартсменам. Турызм прыносіць ім бадзёрасць і задавальненне, радасць перамогі над крутым перавалам, бурнай ракой, цяжкім пераходам.

**С. КАНСТАНЦІНАЎ.**

# БЫЦЬ НАДЗЕЙНАЙ ЗМЕНЕ

**АЛЯКСАНДР АНУФРЫЕВІЧ КОМАШ — слесар вышэйшага разраду, Герой Сацыялістычнай Працы, дэпутат Кастрычніцкага раённага Савета народных дэпутатаў, старшыня Савета настаўнікаў раёна.**

**Сёння А. А. Комаш дзеліцца вопытам работы з моладдзю, расказвае аб развіцці настаўніцкага руху ў аб'яднанні.**

НАСТАЎНІК павінен бачыць у вучнях прадаўжальнікаў сваёй справы, сваю надзейную змену. Таму перш чым даць навічку ў рукі інструмент, даручыць работу, заўсёды расказваю яму пра прадпрыемства, пра механічны цэх, у якім таму давядзецца працаваць. Такая размова прыносіць пэўную карысць — малады чалавек адразу ўсведамляе, якія патрабаванні будуць прад'яўлены да яго, і што ў багатым працоўнымі традыцыямі калектыве трэба будзе працаваць самааддана, з пачуццём адказнасці.

Вучыць асновам прафесіі пачынаю з самага простага (зразумела, простага для тых, хто не абыякава адносіўся ў школе ці вучылішчы да чарчэння, геаметрыі, фізікі, бо на нашым прадпрыемстве без ведаў гэтых прадметаў спецыялістам не станеш)—з вывучэння чарцяжоў. Толькі тады, калі табе дасканала вядома тэхналогія вырабу дэталей, можна брацца за метал. Праўда, на першым этапе імкнуся растлумачыць чарцёж так, каб малады рабочы не проста запомніў яго, а разабраўся ў кожным вузлу і нават задумаўся аб тым, ці можна ўнесці ў яго нешта новае, лепшае. Дарэчы, нашы рацыяналізатары такім чынам нярэдка дапамагаюць распрацоўшчыкам знаходзіць больш эканамічныя, менш працаёмкія варыянты выпуску той ці іншай дэталі. Вырабы, якія мы выпускаем, часцей за ўсё бываюць не серыйнымі, а толькі штучнымі. Таму ў нас нельга працаваць проста «набіўшы руку», нам патрэбны думаючыя спецыялісты. І іменна такога рабочага стараюся выхаваць з навічка.

Працэс абучэння прафесіі слесара імкнуся ніколі не адрываць ад выхаваўчага, таму што станаўленне маладога рабочага — справа не аднаго дня. Тым больш, што прыходзяць да нас — як і ў іншы калектыў — навічкі з рознымі характарамі, з рознымі магчымасцямі.

Быў у мяне адзін вучань, з якім шмат давялося папрацаваць. У брыгаду ён прыйшоў з другога цэха. Там ад яго проста адмовіліся: дрэнна працаваў, у чарку любіў зазірнуць. Здавалася, прападзе хлопец, нельга знайсці на яго ўправу. І ўсё ж на таварысцкім судзе я за яго паручыўся. Быццам падмянілі майго вучня пасля гэтага. Пачаў працаваць старанна, ні разу не парушыў больш ні працоўную, ні грамадскую дысцыпліну.

Некаторыя з маіх вучняў добра працуюць у нашай брыгадзе. Гэта — Сяргей Ганчароў і Сяргей Закроўскі. У калектыве іх лічаць выдатнымі спецыялістамі.

Рух настаўніцтва набывае на нашым прадпрыемстве далейшы размах. Расці надзейнай змене, калі свой багаты вопыт перадаюць моладзі кавалер ордэна «Знак пашаны» Віталій Рыгоравіч Камарнікаў, Уладзімір Іванавіч Карпіловіч, Пётр Фёдаравіч Герман, Валянцін Іванавіч Доўнар і многія іншыя.

Моладзь, якая збіраецца прыйсці працаваць да нас у аб'яднанне, можа разлічваць на іх дапамогу і падтрымку.

# Дзецям на радасць

НЕ ТАК ДАЎНО камсамольска-маладзёжная брыгада аб'яднання завяршыла работы, што прадугледжваліся праектам, па збудаванню ў мікрараёне «Курасоўшчына-1» першай дзіцячай пляцоўкі. Яна вельмі спадабалася маленькім жыхарам мікраёна: да позняга вечара не сціхаюць тут галасы дзяцей.

Пляцоўка «Рамонак», пабудаваная непадалёку ад школы № 97, — адзіная такога роду ў Кастрычніцкім раёне. Ініцыятыва камітэта камсамола ВА «Інтэграл» па стварэнню такіх комплексаў знайшла адабрэнне ў райкоме партыі і РК ЛКСМБ.

Слаўна папрацавалі на збудаванні першай чаргі «Рамонка» маладыя «інтэгралаўцы» Р. Пірожнік, Л. Давыдзенкаў, У. Лебядзевіч, А. Селівончык, А. Сафанаў, П. Папоў, А. Етка, І. Глушцоў і многія іншыя. У гэтыя дні камсамольцы і моладзь аб'яднання вядуць будаўніцтва другой чаргі дзіцячай пляцоўкі.

**В. ГІЗУЛЕЎСКІ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола ВА «Інтэграл».**



•

З кожным днём шырыцца размах сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар 60-годдзя ўтварэння Саюза ССР. Перадавыя работнікі ВА «Інтэграл» бяруць павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы, імкнуцца перавыканаць асабістыя заданні. Сярод тых, хто сёння актыўна ўключыўся ў ганаровую вахту, і Тамара Міхайлаўна Бязручка, кавалер ордэнаў працоўнай Славы II і III ступені, брыгадзір цэха № 21, ініцыятар руху «Пяцігадовае заданне — меншым саставам».

**На здымку: Т. М. Бязручка.**

•



# ДАРОГА Ў ПЯЦЬ ГАДОЎ

СЯРГЕЯ БАСЬКО яшчэ не назавеш ветэранам прадпрыемства, хоць і працуе ён у цэху № 24 з першых дзён яго заснавання. Пяць гадоў мінула з той пары, як закончыў Сяргей універсітэт і па размеркаванню трапіў на ВА «Інтэграл». Выбар месца працы не быў выпадковым. Яшчэ студэнтам хімічнага факультэта юнак праходзіў вытворчую практыку на аб'яднанні. Спадабалася яму тут. Добры, дружны калектыў, работа цікавая, новае абсталяванне, ёсць дзе прымяніць набытыя веды маладому спецыялісту. Тут жа, на аб'яднанні, у шаснаццатым цэху абараняў ён свой дыплом. Дарэчы, тэма дыплома была цесна звязана з вытворчасцю, вырашала шэраг пытанняў тэхналогіі. Так што пэўнае ўяўленне аб прадпрыемстве ў Сяргея ўжо было.

Але ніколі не думаў Басько, што прыйдзецца яму адразу стаць майстрам, узначальваць калектыў з 57 чалавек. Прытым калектыў дзявочы. Было ад чаго разгубіцца. Вопыту работы з людзьмі не хапала, калі не лічыць педагагічную практыку ў школе № 50. І вось тут, як ніколі раней, спатрэбіліся хлопцу веды, набытыя ў будаўнічых атрадах, пачуццё асабістай адказнасці за даручаную справу, якое загартоўвалася ў СБА «Ураган», што працаваў недалёка ад Мурманска, у пасёлку «Палярныя Зоркі».

А работа, якую выконвае змена майстра Сяргея Басько, сапраўды адказная. На яго ўчастку пачынаюць свой шлях да пакупнікоў вядомыя гадзіннікі маркі «Электроніка». Тут праходзіць адна з самых адказных аперацый — мантаж плат. Недасведчанаму чалавеку, безумоўна, цікава паназіраць, як ідзе працэс разваркі паўправадніковага крышталю — сэрца будучага гадзінніка. А дзяўчатам, што працуюць на ўчастку, няма часу любавацца сваёй работай. Ад іх уважлівасці, зладжанасці, майстэрства ў многім залежыць якасць гадзіннікаў.

Сяргей шчыра прызнаўся, што працай сваёй задаволены. Марыў стаць студэнтам БДУ — стаў. Яшчэ ў школе захапляўся прыродазнаўчымі навукамі. Таму і выбраў хімічны факультэт. Веды ніколі і нікому не даставаліся лёгка. Сяргею таксама. Затое як яны спатрэбіліся яму тут, на вытворчасці. А калі ўзнікаюць якія-небудзь цяжкасці, тады на дапамогу прыходзяць былыя аднакурснікі, што працуюць побач: Міхаіл Рудчанка — старшы майстар цэха № 45, Светаслаў Філіповіч — тэхнолаг цэха № 37.

Сведчанне ўдарнай працы — яе выніковасць, дасягненні калектыву. А яны на ўчастку Басько немалыя. Дзяўчаты працуюць па перадавому метаду брыгаднага падраду, неаднаразова змена выходзіла пераможцам працоўных вахт ў гонар 60-годдзя ўтварэння СССР, называлася лепшай у цэху.

**М. МІРГАРОДСКІ.**

КАЛЕКТЫВЫ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ карыстаюцца ў работнікаў «Інтэграла» заслужанай папулярнасцю. Добрая слава ідзе аб народным хоры аб'яднання, дзіцячым ансамблі бальнага танца «Усмешка», якому нядаўна прысвоена ганаровае званне «узорны». Кіраўнікі калектыву

— Не трэба так рэзка, вы ж ўсе можаце, апошнюю ноту цягніце мякчэй, а то як на фініш прыйшлі і ўпалі. Мне патрэбна праўдзівая эмоцыя, радасная, а вы не даяце ёй выхаду. «А-а-х ты, Юрачка...» — спявае сам. — Памятайце, лёгка і светла, з гумарам... Ну, пачалі...

# АДДАНАСЦЬ ПЕСНІ

— дыпламанты Усесаюзных конкурсаў бальнага танца, былыя работнікі прадпрыемства Жана і Уладзімір Шалькевічы.

Усяго тут працуе 39 гурткоў мастацкай самадзейнасці, якія аб'ядноўваюць паўтары тысячы чалавек. У рабочых інтэрнатах хлопцы і дзяўчаты маюць магчымасць рэалізаваць свае творчыя імкненні ў разнастайных клубах. Жаночыя клубы «Алеся», «Гаспадыня», клуб сучаснай музыкі «Аспект» і многія іншыя прыцягваюць моладзь, паспяхова вырашаюць праблему вольнага часу.

Сёння мы раскажам аб народным хоры аб'яднання. Створаны ён у 1975 годзе. Праз два гады стаў лаўрэатам І Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці, а яшчэ праз год атрымаў ганаровае званне «народны». З гэтай пары Народны хор «Інтэграла» нязменны ўдзельнік і дыпламант самых прадстаўнічых рэспубліканскіх конкурсаў мастацкай самадзейнасці.

Дзіўнае пачуццё ахоплівае, калі прысутнічаеш на рэпетыцыі хору. Штосьці падобнае таму, якое ўзнікае, калі прыязджаеш у родныя мясціны, дзе нарадзіўся і вырас. Радасць сустрэчы змяняецца здзіўленнем, у прывычным раптам адкрываеш незвычайнае. Даўно знаёмыя песні ў выкананні хору хвалявалі і кранали сэрца шчырасцю, асаблівай эмацыянальнай завершанасцю. Іменна чысціні вобразнага малюнка, хай гэта гарэзлівая, вясёлая песня «Юрачка», ці сумна-трывожная «Невядомы салдат», мякка, але настойліва патрабаваў ад выканаўцаў кіраўнік самадзейнага народнага хору аб'яднання Леанід Волчак.

...І зноў у руках баян. Добры, бадзёры позірк на ўдзельнікаў, і іскрыстая лёгкая мелодыя «Юрачкі» набірае сілу. Але нечакана змаўкае.

Хор і кіраўнік на дзіва тонка разумелі адзін аднаго. Паміж імі ўсталявалася добрая атмасфера сумеснай творчасці, калі ўдзельнік хору штосьці падказвае, ці крытычна ацэньвае якое-небудзь рашэнне. Вось і зараз адна з «харыстак» упэўнена зазначае:

— Ведаеце, у гэтым месцы мы неяк не так спяваем. Па-мойму, неабходна больш адкрыта, цёпла, а ў нас гук нейкі задаўлены.

Зноў удакладняюцца адценні. Ледзь-ледзь змяшчаюцца акцэнты, а песня ўжо гучыць па-новаму. І гэтак на кожнай рэпетыцыі: ідзе пошук выразных сродкаў, праўдзівых інтанацый.

У рэпертуары калектыву — песні лірычнага, грамадзянскага, патрыятычнага гучання. Асобнае месца сярод іх займаюць народныя песні.

— Народная песня — гэта той выток, з якога музыканты чэрпаюць творчыя сілы, — гаворыць Леанід Аляксандравіч. — Як каменьчык у рэчцы, яна доўгія гады шліфавалася і ўдасканальвалася. Трэба толькі здолець адкрыць яе прыгажосць, данесці да слухача. Гэта тое асноўнае, дзеля чаго мы працуем. Часта выступаем з канцэртамі перад рабочымі, калгаснікамі, воінамі. Імкнёмся выхоўваць эстэтычны густ у слухачоў.

У хоры спявае моладзь розных прафесій і ўзростаў. Аб'ядноўвае іх вялікая любоў да песні. Тут, у хоры, яны атрымліваюць творчае і эстэтычнае задавальненне, не толькі вучацца прыгожа і правільна спяваць, але і выпрацоўваюць дыкцыю, уменне трымацца на сцэне. Спасцігаючы прыгажосць у песні, вучацца бачыць і цаніць прыгажосць у прыродзе, чалавечых адносінах.

**В. МАРОЗАВА.**

# Клопат аб адпачынку

*ВЯЛІКУЮ ЎВАГУ надаюць кіраўніцтва, партыйны камітэт аб'яднання змястоўнаму адпачынку работнікаў. Нядаўна ўступіў у строй новы камфартабельны корпус завадскога санаторыя-прафілакторыя на 100 месц. Пачынаецца будаўніцтва яшчэ двух карпусоў. Размешчаны яны ў маляўнічай мясцовасці ля водасховішча «Вяча». Побач і піянерскі лагер «Мір», дзе праводзяць летнія канікулы дзеці працаўнікоў «Інтэграла». Тут і ў піянерлагеры «Зарніца» штогод адпачываюць каля трох тысяч школьнікаў. У зімовы перыяд на базе адпачынку «Мір» арганізуюцца завадскія і цэхавыя спартакіяды, для іх ўдзельнікаў прадугледжваецца культурная праграма. Ды і кожны рабочы можа тут цікава і карысна правесці выхадныя дні.*

*Калі гаварыць на мове лічбаў, то кожны чацвёрты рабочы аб'яднання адпраўляецца ў час водпуску ў пансіянаты, санаторыі, дамы адпачынку.*

*Папулярнымі ў нас з'яўляюцца разнастайныя паездкі па пуцёўках выхаднога дня. Іх маршруты пралягаюць у розныя куткі нашай краіны. У дні школьных канікул такімі пуцёўкамі карыстаюцца дзеці. Штогод на гэтыя мэты выдзяляюцца вялікія сродкі.*

*Г. ШАБАН,*
*намеснік старшыні прафкома ВА «Інтэграл».*



*НА ЗДЫМКУ: новы корпус санаторыя-прафілакторыя на 100 месц.*

**Фота А. ЕРЗЯНКОВА.**

# Лагоднасць

**ЦІ ПАТРЭБНА ЯНА НА СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫМ КАМСАМОЛЬСКІМ СХОДЗЕ!**

УСЁ БЫЛО ПАВАЖНА. Чырвоны абрус на стале, кветкі, нават плакат, падыходзячы да выпадку, знайшоўся. Другакурснікі дзесятай групы педагагічнага патоку механіка-матэматычнага факультэта праводзілі справаздачна-выбарны камсамольскі сход. Прывычна чытаўся з аркуша даклад, фразы, шматкратна абкатаныя і сцёртыя ад доўгага карыстання, павісалі ў паветры. Не бяруся сцвярджаць, ці слухалі справаздачу камсамольцы, але сядзелі ціха: хто адкінуўся на спінку парты, хто падпёр рукой галаву. «Рашуча выкараняць абыякавасць і фармалізм», — працягвала дакладчыца — камсорг групы Рыма Вайцэхоўская. Стракацелі ўсялякія лічбы, успаміналіся стопрацэнтныя паспяховасць, наведванне...

Усё гэта было безумоўна важным і гэтак жа безумоўна праходзіла міма разумення. Неяк бязрадасна выглядалі ў дакладзе камсамольскія справы. А расказаць было пра што, адзін трэці працоўны семестр чаговарты! Пяць дзяўчат з групы — байцы камуністычнага СБА «Маладосць», яны першымі са студэнтаў рэспублікі працавалі педагогамі ў дзіцячым доме № 2. Зразумела, што ў вопыт работы групы дзяўчаты змаглі б унесці шмат каштоўнага. Размовы пра бурныя камсамольскія сходы «Маладосці» не заціхаюць і сёння. Аднак справаздачны даклад толькі канстатаваў факт самой працы, не больш.

Вядома, справаздачна-выбарныя камсамольскія сходы — гэта перш за ўсё шчырая размова пра зробленае. Але шчырасці на гэты раз, на жаль, не было. А, сапраўды, нават у справаздачнай скорагаворцы ўважлівы слухач прыкмеціў бы сама меней з дзесятак тэм для сталай, сур'ёзнай, самакрытычнай размовы. Дастаткова сказаць, што ў групе ніхто не наведвае спартыўных секцый, навуковых гурткоў, некаторыя студэнты да гэтага часу маюць акадэмічныя запазычанасці. Але справа нават і не ў недахопах, іх пералічылі. Бяда ў тым, што не сталі гэтыя факты падставай для аналізу працы ўвогуле, таму заўвагі і вывады, якія прагучалі на сходзе, былі абстрактнымі, і, значыць, цяжкімі для выканання. Трэба вучыцца ставіць канкрэтныя мэты, тады не давядзецца ліхаманкава капацца ў памяці, каб успомніць, чым жа займалася ў мінулым навучальным годзе група. Але, калі павярхоўнасць справаздачы яшчэ можна растлумачыць нявопытнасцю камсорга, дык пазіцыя групы тлумачэнню паддаецца з цяжкасцю. Маўчаць, безумоўна, лягчэй за ўсё, потым дзе-небудзь на калідорах можна будзе і на нуду паскардзіцца, і паўздыхаць аб мінулым энтузіязме...

Злёгку парушыла ўсеагульную лагоднасць выступленне праформа — Галі Мурашка:

— Лічу работу камсамольскага бюро групы нездавальняючай. Амаль што бяздзейнічала рэдкалегія. А спартыўна-масавы сектар, ён што рабіў?

Вось тут бы, здаецца, і ўскалыхнуцца групе, і разабрацца ва ўсіх «плюсах» і «мінусах», адкрыта пагаварыць. Але...

— Не ператварайце сход у базар! — паляцеў у зал гнеўны вокрык з прэзідыума. А мне так хацелася адкінуць ролю пабочнага наглядальніка і сказаць ім: «Рабяты, мілыя, гэта ж добра. Спрачайцеся, хвалюйцеся, успамінайце, дзе былі «на вышыні», а дзе, як кажуць, маху далі. Прачніцеся! Няхай ён будзе, гэты «базар», калі ўжо называць базарам калектыўны абмен думкамі. Сход і ставіць сваёй мэтай карэкціроўку поглядаў, выпрацоўку агульных меркаванняў».

Мне могуць запярэчыць: ёсць пэўная форма правядзення камсамольскіх сходаў. Але ці варта, толькі каб дагадзіць форме, начыста забываць пра змест? Форма—гэта ж не догма, яна можа і павінна змяняцца, удасканальвацца, рабіцца мабільней. Я ўсё спрабавала зразумець, чым жа адрозніваецца гэты камсамольскі сход у ВНУ ад школьнага? Тым, што няма на ім класнага кіраўніка? Але адсутнасць кантролю аўтаматычна да самастойнасці не прыводзіць. І словы, карысныя і правільныя, не сведчаць яшчэ аб дакладнасці думкі. Толькі па рэальных справах ацэньваецца ступень сталасці. Не пабаяцца быць «белай варонай» — гэта таксама ўчынак. Галя Краўчанка, сакратар педпатоку мехмата, студэнтка гэтай жа групы, на мой погляд, не баіцца. Яна не саромеецца сваёй шчырасці, не хавае зацікаўленых адносін да ўсяго, што яе акружае. Ёй, сапраўды, да ўсяго ёсць справа, таму скардзіцца на нуду і ў галаву не прыходзіць. Але нават і яна, нягледзячы на ўсе намаганні, не змагла перамагчы сілу інерцыі. І што здзіўляе, група — не з самых дрэнных. І дні нараджэння адзначаюцца, і «агеньчыкі», і дыспуты — усё гэта было, і усім цікавым здавалася, асабліва на першым курсе. Што ж здарылася? Заела цякучка, кантрольныя і семінарскія, залікі і экзамены засланілі ўсё астатняе, звялі на нішто нефармальныя чалавечыя зносіны? Да таго ж, спрадвечныя спасылкі на недахоп часу нішчаць і самыя цудоўныя ініцыятывы: шэфства над магілай невядомага салдата так і засталося не больш чым пражэктам.

Няма слоў, занятыя рабяты, але, як справядліва заўважыла адна са студэнтак, спешка часцей за ўсё бывае бесталковай. Асабліва гэта прыметна ў інтэрнаце. Здаецца, гадзіну назад рваўся чалавек з універсітэта, крычаў, што спраў многа, а бачыш, бадзяецца з пакоя ў пакой, вытаргаваны час забівае. Вось, дарэчы, і яшчэ адна тэма для размовы на камсамольскім сходзе. Чаму яшчэ так многа ў дарослых людзях дзяцінства — у дрэнным разуменні гэтага слова? Чаму ўсё часцей з'яўляецца ў студэнтаў жаданне прыйсці на падрыхтаванае, спажываць зробленае меншасцю. Адкуль гэтая маўклівая гатоўнасць праглынуць чарговую порцыю прэснай кашкі, будзь тое слабы даклад, нецікавы вечар ці дрэнна падрыхтаваны спартыўны турнір? Чаму нічога не выклікае абурэння і тоне ці ў кулуарных гутарках, ці ў халодных хвалях абыякавасці?..

Выкарыстала слова, якое далі мне як госцю. Ну, мяркую, не можа быць, каб не разгаварыла іх. Тэма вострая, набалелая. Дзе там — вочы ў падлогу, нясмелыя ўздыхі, а ў падтэксце чуваць: «І чаго распінаешся? Ці не ведаеш, што было, тое і будзе...» «Моцная» палова чалавецтва ў большасці выпадкаў наогул лічыла за лепшае маўчаць. Праўда, Саша Баранаў праявіў зайздросную вынаходлівасць, калі адмаўляўся ад пасады камсорга: «Рабяты, разумееце, камсорг у вучобе прыкладным павінен быць, а я... бывае нічога, а бывае — самі ведаеце...»

Бясспрэчна, камсорг — прыклад, але астатнім — не камсоргам — што, індульгенцыя дадзена пагультайнічаць, калі захочацца? Гэта, мякка кажучы, несур'ёзна.

Як ацэньваюць яны самі мінулы сход, які быў закліканы адлюстраваць год з жыцця групы? Уступіўшы настойлівым маім просьбам, неахвотна ўзняўся Коля Шалькевіч:

— Ну-у-дна... — працягнуў глыбокадумна, і павісла над аўдыторыяй цішыня...

Гавораць, той жа самы Коля вылучыўся дасціпнасцю на адным з вечароў. Проста быў у настроі ці здолеў нечакана раскрыцца? Для групы гэта так і засталося тайнай. Дарэчы, ходзяць чуткі, што зараз ён раптоўна вырашыў стаць вучоным і ўсё «мірское» яго не цікавіць. Забыў, напэўна, Коля, што і вучоныя, і педагогі, а іх і рыхтуе педпаток, — гэта людзі, па самому прызначэнню свайму — грамадскія дзеячы, быць у баку ад жыцця ім не дазволіць прафесія.

Паўтару яшчэ раз: група сама па сабе нядрэнная, таму ёсць надзея, што з новым камсоргам — Нінай Кішкевіч — праца пойдзе на лад, а наступны справаздачна-выбарны камсамольскі сход не будзе данінай шаблону, а стане прынцыповым, патрабавальным, аб'ектыўным аглядам зробленага. Думаць пра гэта трэба ўжо сёння, і не толькі тым, хто па школьнай звычцы завецца актывам. Справа знойдзецца кожнаму.

**Н. КАЛІШЭВІЧ.**

# Расце інтарэс да грамадскіх навук

**Аб выніках нядаўна праведзеных сацыялагічных даследаванняў па просьбе карэспандэнта АЛЯКСАНДРА САПСАЯ расказвае дырэктар Навукова-даследчага цэнтра Вышэйшай камсамольскай школы пры ЦК ВЛКСМ доктар філасофскіх навук, прафесар ЮРЫЙ ВОЛКАЎ.**

— Вучоныя праблемнай лабараторыі камуністычнага выхавання моладзі, што працуе ў МДУ, правялі анкетнае апытанне больш за 1,5 тысячы студэнтаў другога і чацвёртага (часткова пятага) курсаў гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтаў Маскоўскага, Латвійскага і Тбіліскага універсітэтаў. У выніку даследавання высветлілася: тры чвэрці ўдзельнікаў апытання маюць трывалы інтарэс да вывучэння грамадскіх навук, каля 30 працэнтаў студэнтаў гэтай катэгорыі імкнуцца асабліва глыбока вывучаць першакрыніцы, навуковую літаратуру.

Акрамя таго, яшчэ прыкладна чацвёртая частка ўсіх апытаных выказвае свой інтарэс да грамадскіх навук, якія дапамагаюць ім асэнсаваць грамадскія з'явы, атрымаць адказ на многія актуальныя пытанні сучаснасці. Аднак гэты інтарэс абмяжоўваецца толькі рамкамі прапанаванай літаратуры і заняткамі па грамадскіх дысцыплінах у працэсе вучобы ў ВНУ. Толькі невялікая частка з гэтай чвэрці адказала даволі няпэўна. І зусім нязначная частка тых, у каго няма вялікай цікавасці да грамадскіх навук. На мой погляд, гэта зразумела, таму што ў большасці з іх адначасова адзначаецца ў анкетах і нязначны інтарэс да атрыманых прафесійных ведаў, да той спецыялізацыі, якая выбрана пры паступленні ў ВНУ. Прычына ў тым, што яшчэ ёсць нейкая частка студэнтаў, якія паступілі ў ВНУ не з-за вялікай зацікаўленасці той ці іншай прафесіяй, спецыяльнасцю, а ці па загаду бацькоў, ці з-за карысных мэт.

**— Што можна сказаць аб адносінах рабочай моладзі да папаўнення грамадска-палітычных ведаў!**

— У 1980 годзе мае калегі правялі даследаванні сярод гарадской і сельскай рабочай моладзі ў Малдавіі, якія паказалі, што для большай часткі гэтай катэгорыі маладых людзей імкненне да папаўнення грамадска-палітычных ведаў дастаткова высокае. Гэтае ж анкетнае апытанне канкрэтна паказала, якія навукі і галіны грамадазнаўства больш цікавяць рабочую моладзь. 40 працэнтаў удзельнікаў апытання найбольш цікавяцца вывучэннем біяграфіі і творчай спадчыны У. І. Леніна. 35 працэнтаў лічаць, што найбольш карысным для іх з'яўляецца вывучэнне пытанняў міжнароднага камуністычнага руху. Больш за 30 працэнтаў захапляюцца пытаннямі знешняй палітыкі КПСС. Даволі высокая цікавасць да праблем гісторыі ВЛКСМ, права, сацыялістычнай законнасці і іншых. Параўнаўча недастатковым, на мой погляд, застаецца інтарэс рабочай моладзі да праблем палітычнай эканоміі, эстэтыкі, этыкі, філасофіі.

**— Чым, на ваш погляд, выклікана актыўнасць савецкай моладзі да вывучэння грамадскіх дысцыплін!**

— На гэта ўздзейнічае цэлы рад фактараў. Перш за ўсё, зразумела, павышэнне палітычнай культуры савецкіх людзей, сам лад жыцця, складанасць праблем грамадскага развіцця ва ўмовах суіснавання дзвюх супрацьлеглых палітычных сістэм, праблемы міжнародных зносін і іншыя. Акрамя таго, вялікая цікавасць да грамадскіх навук у савецкай моладзі звязана і з агульным ростам адукацыйнага і культурнага ўзроўню насельніцтва краіны, з удасканаленнем мэтанакіраванай выхаваўчай работы і вучэбнага працэсу ў сярэдняй і вышэйшай школе. Значная частка апытаных адзначае вялікую ролю ў абуджэнні гэтага інтарэсу спецыяльных тэле- і радыёперадач, а таксама заняткі ў гуртках палітычнай адукацыі.

У нашых анкетах было спецыяльна зададзена пытанне: «Што прымусіла вас займацца грамадскімі навукамі?» Больш за 54 працэнты ўдзельнікаў адзначылі імкненне паглыбляць веды па грамадска-палітычных праблемах, а заняткі грамадскімі навукамі, вывучэнне творчай спадчыны Маркса, Энгельса, Леніна дапаможа пашырыць гэтыя веды.

Наш ідэал, вядома, заключаецца ў тым, каб кожны малады чалавек праяўляў устойлівы інтарэс да авалодвання грамадскімі ведамі. Даныя, што атрыманы намі, з'яўляюцца выбарачнымі. Тым не менш яны даюць падставу сцвярджаць, што ўзровень інтарэсу савецкай моладзі да грамадскіх навук даволі высокі.



## АСЕННІ ЭЦЮД

*У ПАРКАХ І ЛЯСАХ, у скверах і садах гаспадарыць восень. Раптам халодны паўночны вецер нагоніць нізкія хмары, шпурляне ў твар першыя кроплі дажджу, і вось ужо нудная імжа вісіць над зямлёй. Здаецца, усё навокал патанула ў шэрых мутных лужынах: і вуліцы, і людзі, і машыны. Ці будзе канец гэтаму дажджу? Але аднойчы надвячоркам праб'ецца праз хмары скупы сонечны прамень. А назаўтра сплыве ў лагчыны мяккі, нібы вата, туман, засвецяцца золатам дрэвы. Шапоча пад нагамі лісце, ляціць па-над зямлёй павуцінне. Бабіна лета—апошняя ўсмешка восені.*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

28 кастрычніка 1982 г.
Зак. 1902 АТ 21540

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ